УДК 069.1:316.72(=161.3)

# Музеялагічная парадыгма засваення культурнай спадчыны гістарычнага горада

***Джумантаева Т.А.***
*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік*

*У год гістарычнай памяці, якім абвешчаны ў нашай краіне 2022 год, нам падаецца актуальным зварот да даследавання праблем засваення гісторыка-культурнай спадчыны краіны музейнымі сродкамі. У артыкуле разглядаецца музеялагічная парадыгма засваення гісторыка-культурнай спадчыны гістарычнага горада, алгарытм якой выглядае наступным чынам: публічная памяць – гісторыка-культурная спадчына – музей-запаведнік – культурная прастора гістарычнага горада (крэатыўная прастора) – мясцовая супольнасць. Інтэграцыя музея ў прастору гістарычнага горада адбываецца метадамі музеефікацыі і рэпрэзентацыі культурнай спадчыны праз ажыццяўленне партыцыпатыўнай праектнай дзейнасці, у якой галоўная роля адводзіцца творчасці прадстаўнікоў мясцовай супольнасці. Крэатыўная прастора гістарычнага горада разглядаецца як шматгранны і суцэльны феномен культуры, стварэнне якога можа быць звязана з музейнай дзейнасцю. У метадалагічным плане пры падыходзе да праблемы мэтазгодна абапірацца на палажэнні перспектыўнага ў музеялогіі даследчага накірунку, распрацаванага вядомым музеёлагам Т. Шолай, – мнемасофіі (навука пра публічную памяць). Мнемасофія канцэптуалізуе музеі як асноўныя формы публічнай памяці. Спадчына фарміруецца калектыўным сацыяльным вопытам і пры дапамозе навукі набывае сваю вышэйшую якасць – становіцца публічнай памяццю.*

***Ключавыя словы:*** *гістарычны горад, культурная спадчына, мнемасофія, музеефікацыя, публічная памяць, рэпрэзентацыя.*

*(Искусство и культура. – 2023. – № 1(49). – С. 57–60)*

# Museological Paradigm of the Development of the Historical City Cultural Heritage

***Jumantayeva T.A.***
*National Polotsk Historical and Cultural Museum-Reserve*

*In the year of historical memory, which was declared in our country in 2022, it seems to us relevant to address the study of the problems of mastering the historical and cultural heritage of the country by museum means. The article considers the museological paradigm of the development of the historical and cultural heritage of a historical city, the algorithm of which looks as follows: public memory – historical and cultural heritage – museum-reserve – cultural space of the historical city (creative space) – local community. The integration of the museum into the space of the historical city takes place by the methods of museumification and representation of cultural heritage through the implementation of participatory project activities, in which the main role is given to the creativity of representatives of the local community. The creative space of the historical city is considered as a multifaceted and continuous phenomenon of culture, the creation of which can be associated with museum activities. In methodological terms, it is advisable to build an approach to the problem on the provisions of a promising research direction in museology – mnemosophy (the science of public memory), developed by the famous museologist T. Shola. Mnemosophy conceptualizes museums as the main forms of public memory. Heritage is formed by collective social experience and, with the help of science, acquires its highest quality – it becomes a public memory.*

***Key words:*** *historical city, cultural heritage, mnemosophy, museumification, public memory, representation.*

*(Art and Cultur. – 2023. – № 1(49). – P. 57–60)*

На сучасным этапе развіцця беларускага грамадства досыць вялікая ўвага звернута на гістарычную памяць як сістэму сацыякультурных метадаў і інстытутаў, якія прызваны кантраляваць і пераўтвараць важныя для сучаснага моманту сацыяльныя веды і каштоўны грамадскі вопыт у інфармацыю пра мінулае для перадачы новым пакаленням. Нездарма «… у мэтах фарміравання аб'ектыўных адносін грамадства да гістарычнага мінулага, захавання і ўмацавання адзінства беларускага народа» 2022 год у Рэспубліцы Беларусь абвешчаны Годам гістарычнай памяці [1].

Сярод розных узроўняў гістарычнай памяці, абумоўленай дыскурсіўнай стратыфікацыяй соцыуму, вылучаецца культурная памяць; яна, па меркаванні нямецкага гісторыка культуры Яна Асмана, умацоўваецца пры дапамозе

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: tamara.jum@gmail.com – Т.А. Джумантаева*

культурных сімвалаў (манумент, тэкст, рытуал) і інстытуцыянальнай камунікацыі (практыка, музейная інтэрпрэтацыя…) [2]. Культурная памяць фармалізавана, а механізмамі яе захавання могуць быць сацыяльныя інстытуты, якія пад уздзеяннем глабалізацыі фіксуюць хуткія змены сацыякультурнага жыцця людзей. Адчуваючы "шок будучыні" (па Э. Тофлеру [3]), яны пад уздзеяннем хваль гістарычных перамен цалкам адпрэчваюць мінулае, а страта імі культурных узораў замяшчае ранейшыя механізмы памяці. У гэтым кантэксце праблема засваення гісторыка-культурнай спадчыны праз музеялагічныя практыкі набывае асаблівае гучанне і з'яўляецца актуальным напрамкам культуралагічнага даследавання.

Культуралагічны падыход прадугледжвае інтэграванае пазнанне наваколля і створанага чалавекам культурнага сусвету, дыялог матэрыяльных, духоўных і мастацкіх складнікаў гэтага сусвету, а таксама канцэнтрацыю асобных даследчых аспектаў да ўзроўню сістэмнага абагульнення. Рэгіянальнае даследаванне ў культуралагічнай праекцыі павінна стаць падмуркам для вылучэння новага навуковага напрамку, у якім крэатыўная прастора гістарычнага горада будзе разгледжана як шматгранны і суцэльны феномен культуры, стварэнне якога можа быць звязана з музейнай дзейнасцю праз такія музеялагічныя механізмы, як музеефікацыя і рэпрэзентацыя. У метадалагічным плане пры падыходзе да праблемы мэтазгодна абапірацца на палажэнні перспектыўнага ў музеялогіі даследчага накірунку, распрацаванага вядомым музеёлагам Т. Шолай, – мнемасофіі (навука пра публічную памяць) [4]. Мнемасофія канцэптуалізуе музеі як асноўныя формы публічнай памяці. Спадчына фарміруецца калектыўным сацыяльным вопытам і пры дапамозе навукі набывае сваю вышэйшую якасць – становіцца публічнай памяццю [4, с. 43–44].

**Публічная памяць і гісторыка-культурная спадчына.** Магчымасць перадаць вопыт, сістэмы каштоўнасцей і мудрасці з'яўляецца самай важнай якасцю памяці. Памяць заўжды звязана з феноменам адбору, з ідэнтычнасцю і суб'ектыўнасцю. Пры гэтым мы разумеем, што наша гісторыя – гэта тое, што мы хацелі б задакументаваць, каб яна стала спадчынай, з якой потым мы пачынаем працаваць і якую можам трансліраваць. У той жа час спадчына з'яўляецца канструктам, які ствараецца, умацоўваецца ці адмаўляецца пры дапамозе маральных абгрунтаванняў. Пытанні для абгрунтавання выглядаюць наступным чынам: навошта нам трэба менавіта гэта спадчына, дзеля якіх мэт (навука, адукацыя, палітычныя праекты, паляпшэнне якасці жыцця, вольны час…)? Такім чынам, спадчына адрозніваецца ад гісторыі дзейсным уключэннем у працэс людзей. Яна фарміруецца калектыўным сацыяльным вопытам і, як было згадана вышэй, пры дапамозе навукі становіцца публічнай памяццю. Навука адыгрывае сваю важную інструментальную ролю. Метады і прынцыпы навуковага вывучэння спадчыны акультурваюць яе, і яна становіцца публічнай памяццю. Апошняя ў сваю чаргу збіраецца, вывучаецца, захоўваецца і рэпрэзентуецца праз сэрвісы інстытутаў публічнай памяці. Публічная памяць з'яўляецца абстрактным феноменам, які ўвасабляе ў сабе спробы любога грамадства дасягнуць згоды ў адборы аб'ектаў уласнай спадчыны [4]. Публічная памяць працуе на грамадства і ўдзельнічае ў яго развіцці. Заснаваная на гісторыі, рэалізаваная публічнымі інстытутамі (у тым ліку і музеем), яна ўяўляе сабой свядомы навуковы, грамадскі, палітычны і тэхналагічны базіс, "афіцыйную" платформу, якая транслірує практычна грамадскую свядомасць і сацыяльна прымальнае веданне. Гэта і ёсць мнемасфера, сфера згоды соцыуму з нагоды ўласнай спадчыны. Яе матэрыяльны складнік можа доўга заставацца нязменным (напрыклад, музейныя калекцыі захоўваюцца на працягу стагоддзяў), але публічная памяць, грамадскае стаўленне да спадчыны, правілы, сістэмы каштоўнасцей і інстытуты памяці могуць мяняцца [4]. Спецыяльныя інстытуты публічнай памяці складваліся ў час працэсу інстытуцыялізацыі грамадскіх патрэб у выглядзе перш за ўсё музеяў. Яны дапаўняюцца ўзаемадзеяннем з прыродным і гістарычным ландшафтам, нерухомымі помнікамі і прыватнымі калекцыямі, а таксама сістэмамі баз дадзеных. Распрацаванае Т. Шолай паняцце "публічная памяць" стала ключавым тэрмінам, прынятым у гуманітарных і сацыяльных навуках. Прырода спадчыны выяўляецца праз баланс музеялізацыі і камунікацыі, паміж рэальным і адлюстраваным "Я", паміж матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчынай [4]. Такім чынам, стратэгічнае значэнне мае не толькі матэрыяльная спадчына, але нематэрыяльная, а таксама музейныя практыкі і камунікацыі.

**Інтэграцыя музея ў культурную прастору горада.** На шляху актуалізацыі і рэпрэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны важным і надзейным з'яўляецца інстытут музея. Пры гэтым у сучасных умовах у музейнай сферы назіраюцца наступныя тэндэнцыі: змены ў дынаміцы і сэнсах музейных функцый, з'яўленне новых тыпаў і відаў музеяў, пашырэнне межаў музейнай дзейнасці. Традыцыйны музей ператварыўся ў інтэграваны сацыякультурны інстытут, аб'ектамі вывучэння, захавання і інтэрпрэтацыі якога сталі не толькі асобныя артэфакты, але і архітэктурныя помнікі, ансамблі гарадоў, прыродныя ландшафты, пэўныя віды гаспадарчай дзейнасці і духоўнага

жыцця грамадства, адным словам, уся культурная спадчына. Прататыпамі якасна новага віда музеяў з'яўляюцца музеі-запаведнікі.

Важнай місіяй асяродкавага музея (музея-запаведніка) стала не толькі захаванне і прэзентацыя аб'ектаў і прасторы гісторыка-культурнай спадчыны, але і канструяванне адносін з мясцовымі жыхарамі, і непасрэдны ўдзел у паляпшэнні якасці жыцця мясцовай супольнасці. Горад – гэта механізм захавання памяці. Таму, якая памяць кандэнсуецца ў горадзе, на чым музей акцэнтуе ўвагу гараджан, шмат у чым залежыць іх светаадчуванне. Напрыклад, важна выбраць стратэгію ўдзелу жыхароў у працэсе стварэння ўласнай гісторыі. Зварот да гараджаніна як агента гісторыі, якім з'яўляецца кожны чалавек, можа дапамагчы яму стаць больш шчаслівым.

Шматлікія партыцыпатыўныя праекты, якія музей рэалізуе ў гарадской прасторы, значна мяняюць адносіны музея з прадстаўнікамі мясцовай супольнасці. Вынікам падобных практык становіцца ператварэнне музея ў даступнае і неабходнае для жыхароў месца зносін, правядзення вольнага часу і сумеснай дзейнасці. Сусветная музейная супольнасць лічыць, што існаванне музея (тым больш такога асяродкавага, як музей-запаведнік) у горадзе з'яўляецца важным фактарам паляпшэння якасці жыцця яго жыхароў.

Музеі-запаведнікі выконваюць сваю галоўную місію – актуалізуюць і комплексна асвойваюць гісторыка-культурную і прыродную спадчыну, інтэрпрэтуюць аб'екты гістарычнай памяці і фарміруюць на аснове лакальнай ідэнтычнасці прывабны вобраз тэрыторыі, што неабходна яшчэ і для эканамічнага і сацыякультурнага развіцця пэўнай культурнай прасторы (культурнага ландшафту). Комплекснае развіццё музея-запаведніка, накіраванае на актуалізацыю культурнай спадчыны, працуе на яго пазітыўны імідж і сацыяльны прэстыж, спрыяючы задавальненню запытаў і чаканняў сучаснага грамадства (у першую чаргу мясцовай супольнасці).

Зараз музей павінен будаваць сваю дзейнасць на аснове аналізу патрэб мясцовай супольнасці. Апора на інтарэсы мясцовых жыхароў у навукова-фондавай, навукова-даследчай і экспазіцыйнай працы, у культурна-адукацыйных і забаўляльных праектах музея, прыцягненне іх увагі да дасягненняў і праблем музейных прафесіяналаў становяцца ўсё больш распаўсюджанымі. Музей імкнецца да арганізацыі актыўнага ўдзелу насельніцтва ў сваёй дзейнасці як у індывідуальных ініцыятывах, так і праз суполкі сяброў музея, сацыяльныя сеткі, музейныя клубы і іншыя арганізацыйныя формы. Для гэтага музей павінен быць максімальна адкрытым – мець сваё прадстаўніцтва ў Інтэрнэце (сайт, сацыяльныя сеткі), рознымі наяўнымі спосабамі рэгулярна інфармаваць грамадскасць аб сваіх мэтах і задачах, бліжэйшых і перспектыўных планах.

Праектная дзейнасць музея-запаведніка адрозніваецца ад дзейнасці невялікага музея тым, што запаведнік абавязкова мае музейную прастору, якая выходзіць за межы сцен музейнага будынка, прыдатную для правядзення праектных мерапрыемстваў. Запаведнік мае больш шырокі выбар тэм, валодае вялікімі матэрыяльнымі і прафесійнымі рэсурсамі для ажыццяўлення музейных праектаў у гарадской прасторы.

Сучасныя гараджане актыўна ўдзельнічаюць у развіцці і фарміраванні музейнага кантэнту, прысвечанага іх гораду, і гэтыя адносіны адбіваюцца на ўспрыманні імі горада: ён становіцца не толькі месцам пражывання, але і месцам вывучэння. Такім чынам рэалізуецца яшчэ адзін з магістральных трэндаў развіцця сучаснага горада, калі любая тэрыторыя, любая прастора, дзе працуюць з тэмай памяці, мясцовым кантэнтам, дзе гісторыя даступна для вывучэння і дапаўнення, становіцца музеем у пашыраным сэнсе гэтага паняцця – "музеем без межаў" [5].

Каб уявіць ролю музеяў у шырокай перспектыве, можна прывесці разважанні вядомага амерыканскага ўрбаніста Рычарда Флорыды аб тым, што грамадская прастора стала магнітам для талентаў, а гарады на сучасным этапе развіцця з'яўляюцца сховішчамі новага віду багацця, якое стане асноўным эканамічным фактарам новага стагоддзя: яны будуць сталіцамі творчасці [6].

**Гістарычны горад.** Гістарычны горад – гэта не толькі прыродна-ландшафтная прастора, у якую арганічна ўпісаны архітэктурныя ансамблі, музеі і архівы, якія захоўваюць артэфакты рэгіянальнай і айчыннай культур, але і насельніцтва горада са сваімі каштоўнаснымі крытэрыямі ў адносінах да гарадскога асяроддзя. Гаворачы аб месцы кожнага рэгіёна ў агульнанацыянальнай культуры, трэба перш за ўсё зрабіць акцэнт на апошнім фактары, паставіць першачарговую задачу – выхаванне пакалення, мысленне, паводзіны і адносіны якога будуць падрыхтаваны да ўспрымання свайго горада не як правінцыі, а як нацыянальнага набытку. Неабходна на рэгіянальным узроўні фарміраваць комплекс сістэматычных ведаў, традыцый і каштоўнасных арыентацый, якія можна будзе лічыць сістэмай культурнай кампетэнтнасці асобы ў адносінах да навакольнага гістарычнага гарадскога асяроддзя.

Пры ўсёй шматвобразнасці і рознахарактарнасці праяў, на якія здольны горад

у гісторыі культур і цывілізацый, яго часавыя і рэгіянальныя асаблівасці могуць мець месца толькі ў рэальным канкрэтна-гістарычным увасабленні. Як “трывалае ядро” рэгіянальнай культуры, гістарычны горад часта выступае гісторыка-культурнай зонай, якая сфарміравала цэласную прастору кожнага асобнага рэгіёна ў адзінстве ўсіх рэгіянальна-этнічных складнікаў і іх матэрыяльных, духоўных і мастацкіх праяў. Стварэнне цэласнай каштоўнасна-сэнсавай прасторы культурнай гісторыі кожнага асобнага горада магло б прадставіць многія гарады гістарычна значнымі і знакавымі для беларускай культуры рэгіянальнымі цэнтрамі.

Наяўнасць гісторыка-культурнай прасторы – неад’емная прыкмета любога гістарычнага горада. Стварэнне праграм перспектыўнага развіцця немагчыма без уліку гэтай акалічнасці. Ад правільнага асэнсавання зместу гісторыка-культурнай прасторы залежыць эфектыўнасць метадаў яе захавання і выкарыстання ў жыцці сучаснага грамадства. На жаль, часцей за ўсё гісторыка-культурную прастору ўспрымаюць толькі ў горадабудаўнічым аспекце. У такім выпадку акцэнт робіцца толькі на рэстаўрацыі і кансервацыі асобных помнікаў ці матэрыяльных аб’ектаў. Пры гэтым з поля зроку выпадае той факт, што гісторыка-культурная прастора з’яўляецца больш ёмістым паняццем, якое непарыўна звязана з захаваннем, фарміраваннем і існаваннем публічнай памяці. Жыхары горада з’яўляюцца носьбітамі і захавальнікамі гэтай памяці. Яны не толькі карыстаюцца помнікамі, але і фарміруюць крытэрыі адносін да іх. Калі ў грамадскай свядомасці размытыя ці страчаныя культурныя і гістарычныя значэнні помнікаў, то ўкладанне сродкаў у іх ахову не мае сэнсу.

Зыходзячы з гэтай высновы, надзённай задачай культурнай палітыкі краіны павінна стаць далучэнне гараджан да гісторыі культуры роднага горада, іх духоўнае і інтэлектуальнае ўзбагачэнне праз гістарычны вопыт. Культура горада, якая трактуецца як каштоўнасць, норма, традыцыя, непарыўна звязана з нацыянальным тыпам культуры, нацыянальным менталітэтам. Рэгіянальныя тэксты многіх гарадоў – дастаткова змястоўныя, каб праз гісторыю горада можна было сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб культуры рэгіёна і гісторыі культуры Айчыны ў цэлым.

Філ Вуд, супрацоўнік брытанскага праектна-даследчага агенцтва па развіцці творчых падыходаў да культуры і гарадоў “Comedia”, зазначыў, што даследаванні, якія праводзяцца ў гэтым накірунку, пацвердзілі, што мы жывём ужо не ў эпоху прамысловасці, і нават не ў час інфармацыі, а ўступілі ў эпоху творчасці [7]. У кожнага горада і яго жыхароў ёсць свой дух, свой твар, індывідуальнае мінулае і – адпаведна – свая будучыня, звязаная з развіццём творчых падыходаў да культуры гістарычных гарадоў.

**Заключэнне.** Утрымаць памяць шляхам рэканструкцыі асобных матэрыяльных аб’ектаў немагчыма. Памяць – гэта жывы арганізм, які існуе толькі праз культурную самасвядомасць. Двухадзіны працэс ператварэння гістарычнай прасторы ў помнікавую, а помнікавай – у гістарычную ёсць культурны працэс [8], у якім канцэптуальна і згодна з палажэннямі мнемасофіі музей прымае форму публічнай памяці. Пашыраючы межы свайго сэнсу і прызначэння музеі выступаюць не толькі ў традыцыйнай ролі захавальнікаў і транслятараў культурнай спадчыны, але і становяцца арганічнай часткай сучасных сацыяльных і эканамічных працэсаў. Інтэграцыя музея ў прастору гістарычнага горада адбываецца метадамі музеефікацыі і рэпрэзентацыі культурнай спадчыны праз ажыццяўленне партыцыпатыўнай праектнай дзейнасці, у якой галоўная роля адводзіцца творчасці прадстаўнікоў мясцовай супольнасці. Крэатыўная прастора гістарычнага горада разглядаецца як шматгранны і суцэльны феномен культуры, стварэнне якога можа быць звязана з музейнай дзейнасцю праз такія музеялагічныя механізмы, як музеефікацыя і рэпрэзентацыя. На шляху да будаўніцтва крэатыўнага горада музей імкнецца да інтэграцыі ў гарадскую прастору і супрацы не толькі з мінулым, але з сучаснасцю і будучыняй.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Год гістарычнай памяці [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: www.brl.by/by/archive/god-istoricheskoy-pamyati/?. – Дата доступу: 04.06.2022.

2. Ассман, Я. Культурная память: Письмо, память о прошлом и политическая идентичность в высоких культурах древности / Я. Ассман; пер. с нем. М.М. Сокольской. – М.: Языки славянской культуры, 2004. – 368 с.

3. Тоффлер, Э. Шок будущего / Э. Тоффлер; пер. с англ. – М.: АСТ, 2002. – 557 с.

4. Шола, Томислав С. Мнемософия. Эссе о науке публичной памяти / Томислав С. Шола // ИКОМ России; ГМЗ «Ростовский кремль». – Ростов Великий, 2017. – 320 с.

5. Негри, М. Городские музеи: всегда есть чему поучиться [Электронный ресурс] / М. Негри // Музей в городе – город в музее: сб. материалов третьей науч.-практ конф., Москва, 7–8 дек. 2018 г. – Режим доступа: https://mosmuseum.ru/wp/wp-content/uploads/conference/2018.pdf?ysclid=l4022672jw. – Дата доступа: 04.06.2022.

6. Florida, R. The new urban crisis: how our cities are increasing inequality, deepening segregation, and failing the middle class-and what we can do about it / R. Florida. – Basic Books, 2017. – 352 pp.

7. Вуд, Ф. Круговорот городского творчества [Электронный ресурс] / Ф. Вил. – Режим доступа: https://culture29.ru/upload/medialibrary/575/5752b40de121145269f1c4249770f0f5.pdf?ysclid=l40bhvpw13. – Дата доступа: 04.06.2022.

8. Шулепова, Э.А. Наследие как интеграционный компонент памяти поколений / Э.А. Шулепова // От краеведения к культурологии: Российскому институту культурологии – 70 лет / М-во культуры Рос. Федер., Рос. ин-т культурологии; редкол.: К.Э. Разголов (отв. ред.), Э.А. Шулепова, Т.С. Федорова. – М., 2002. – С. 155–166.

*Паступіў у рэдакцыю 21.06.2022*